# Падзяліся ўсмешкаю сваёй

**Усе мы жывём добрымі навінамі. У кожнага яны свае — маленькія ці значныя. Але часам варта імі падзяліцца — калі мы радуемся адзін за аднаго, то становімся мацнейшымі і дабрэйшымі. Паспрабуйце і вы адказаць для сябе на адно простае пытанне:**

## ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?

***Наталля КАРЧЭЎСКАЯ, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры харэаграфіі БДУ культуры і мастацтваў:***

— Падышла чарга на кватэру, і чакаецца, што будаўніцтва дома пачнецца яшчэ сёлета, гэта вельмі ўзрадавала. Таму што сям'я вырасла, хочацца, каб у сыноў былі ўмовы для заняткаў і гульняў. Малодшы сын, двухгадовы Хведар, пайшоў у дзіцячы садок, і яму там падабаецца. Гэта таксама мяне радуе, таму што я са спакойнай душой магу пайсці на заняткі да студэнтаў, якія таксама сталі радаваць. Учора на канцэрце Інаўгурацыі новага навучальнага года я разам са студэнтамі танцавала наш любімы нумар «Нью карнавал», які ўжо быў адзначаны падзякай Міністэрства культуры.

***Віктар АСЛЮК, кінарэжысёр-дакументаліст, член Еўрапейскай кінаакадэміі:***

— Сёння дзень нараджэння сына. На днях адзначылі дзень нараджэння мамы. Гэта для мяне цудоўныя святы. Да гэтага часу я скончыў адзін фільм, які здымаў у Расіі, у Карэліі. І пачынаю яшчэ адзін — ужо ў Беларусі. Ідэя прыйшла, калі мне падарылі кнігу «Гіпіка» 1603 года, якую напісаў Кшыштаф Дарагастайскі, маршалак Вялікага Княства Літоўскага. Тры дні таму быў на Ашмяншчыне, дзе яшчэ захаваліся рэшткі будынкаў таго часу. Але і цяпер там, амаль на мяжы з Літвой, ёсць конны цэнтр, дзе рыхтуюцца спартсмены. Прыгожыя коні, сапраўды заварожваюць. Але я яшчэ не ведаю, як гэта перадаць, як і не ведаю, як будзе ісці праца над фільмам. Усё толькі пачынаецца.

***Вячаслаў ІЗОТАЎ, дырэктар Мінскага духоўнага вучылішча Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы:***

Цікавае пытанне. Шмат добрага. У мяне нарадзілася дзяўчынка, шостае дзіця, жывое, здаровае. Роды ў жонкі прайшлі добра. Цяпер у нашай сям'і тры хлопчыкі і тры дзяўчынкі. Малодшую назвалі Ганнай, ужо пахрысцілі. Яшчэ адно маё дзіця пайшло нядаўна ў першы клас. Поспехі ў дзяцей у школе нармальныя. Справы на рабоце ідуць някепска. 24 верасня мяне прызначылі на пасаду дырэктара, усе віншуюць. На гэты навучальны год у вучылішча набралі 20 новых навучэнцаў. Выставы цяпер цікавыя адкрываюцца ў Мінску: выстава старажытных абразоў у Нацыянальным мастацкім музеі і выстава царкоўнага шыцця ў прыходзе абраза «Усіх тужлівых радасць». Ну, гэта калі коратка...

**Ларыса ЦІМОШЫК, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ